БЕЛАРУСКІ ШЛЯХ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі:
Серпухоуская вул. д. № 12

Рэдакцыя здчынена ад 1 да 2 гадз. пасьля поудня
Адміністрацыя—зрана ад 10 да 2 гадз. У вечары ад 5 да 7 гадз.

Рэдакцыя пакідае за сабой права папраўляць перасыланые рукапісы і карэспондэнцыі.

Цана асобн. нум. 15 К.

Падпіска: з дастаукай да дому у Мінску на 1 месяц 3 рублі.

Цана абвестак:
за верш пэтыту на 1-й стран. 1 руб
на апошняй—50 кап.

Штодзенная грамадзка-палітычная газэта.

№ 20. Менск. Аўторак 16 красавіка 1918 г. Год I

Менск 16/IV.

У Раду Беларускай Народнай Рэспублікі кооптавана група беларускіх дзеячоу, стаячая на платформе Беларускаго Прэдстауніцтва. У гэтай групе есьць социялісты эуропэйскаго фасону і есьць прэдстаунікі беларускай дэмакратычнай інтэлігэнцыі, духавенства праваслаунаго і каталіцкаго.

У Раду Рэспублікі адразу вайшоу моцны «цэнтр», і цяпер праца над адбудаваннем. Беларускай народнай Рэспублікі (Banerstaat) пойдзе моцнымі крокамі.

На колькі Рада пры яе чыста социялістычным складзе мела много крытыкоу дабрахотных і злых, настолькі цяпер—пры новым складзе з беларускім моцным цэнтрам і левым крылом маець можнасьць быць працаздольнай. Правае крыло—з беларускаго нацыянальнаго пагляду—будуць састауляць нацыянальныя меншасьці і цэнтралістычныя партыі.

Патрэбен некаторы час, каб фізіагномія Рады прыняла ясную форму. Цэнтр і левае крыло узаемна прытасуюцца: у нацыянальнай палітыцэ у іх будзе мала рожніцы. у социяльных справах больш, ці менш далекай будучыны захаваецца рожніца пунктоу пагляду.

Мы дачэкаліся вялікай хвілі, калі беларусы зрабілі.

Едзіны н цыянальны фронт.

У беларускім палітычным сьвеце гэта вялікае сьвята. Многа намаглі скарэйшаму ствараныю гэтай еднасьці прэдстаунікі Віленскай беларускай Рады. Менск там лічуць цэнтрам беларускай дзержаунай палітыкі.

Пастаулена толькі літэра *а* у начынаючайся рабоце.

Цяжкі абавязак лег цяпер на Раду Рэспублікі: трэба сьцягнуць Беларусь с тых карчоу, на каторыя сеу яе дзержауны карабель; гэты карабель апрыч таго іщчэ бэз мачтоу, парусу і руля. На Менск цяпер глядзіць уся Беларусь, набітая волею празначэння і больш за яе спрытнымі суседзямі па загародкі, і лініі акопау,—і Дняпро, і Прыпець. Пераглядываюцца паміж сабой беларусы з задзіуленнем і цьверда веруць, што гэта скора скончыцца.

Сэрцамі і нацыянальным пачуццям — мы адна нацыя, і такой застанемся. На Менск лег абавязак мудрай нацыянальнай і міжнароднай палітыкай злучыць усю Беларусь у адну беларускую дзержаву. Дзеля гэтаго мусіць быць зроблена мабілізацыя усіх сіл нашых, стройная арганізацыя іх, зьбіранне усей Беларускай зямлі. На гэта трэба многа халоднаго гаспадарскаго розуму і гарачаго беларускаго сэрца. Словы ні так будуць патрэбны як арганічная праца, безабмылковая тактыка і палітычная вытрымаласьць

С цяжкім возам на гнілой грэблі.

*(Канец *).*

Такім чынам аблегчалася задача утварэння больш—менш поўнаго нацыянальнаго прэдстаўніцва, каторае адказывало-бы „контакту“ з рэвалюцыяй у Расіі і абхоплівало-бы усе палітычныя кірункі на Беларусі. Прыходзілася баяцца толькі, каб правыя расійскія элемэнты запанаваушыя у органах самапрауленния як земскаго так і гарадзкога ні мелі перавагі на з'ездзі, які павінен быў рашаць нацыянальныя беларускія проблемы.

З'езд склікаўся Вялікай Радай с трама другімі беларускімі арганізацыямі: краёвым арганізацыйным бюро рэпрэзэнтаваўшым правыя і масквофільскія беларускія элемэнты хаця і пад флагам расійскіх рэвалюцыйных партыяў, выканаўчым камітэтам 2 бежанскаго з'езду у Маскве так сама рэпрэзантаваўшым хаця і шчыра беларускія але масквофільскія тэндэнцыі і з областным беларускім бюро пры Усерасійскай селянскай Радзе дэпутатаў,—арганізацыя права —с.-р.—ская і масквофільская. Такое злучэнне у працы з масквофіламі па скліканню з,езду ні прыемнае Радзе, вымагалося аднак патрэбаю каб па з,ездзі, была ўся Беларусь, з усі ма яе палітычнымі кірункамі і міжнароднымі орыентацыямі.

З'езд налічаў 1167 дэлегатаў с правам пастанаўляючаго 705 с правам дарадчаго голасу. Цывільныя дэлегаты на ім мелі перавагу,—разам дарадчых і пастанаўляючых 1156 галасоў. Яны прэдстаўлялі земствы, гарады, коопэратыўныя аб'еднаня зямельныя і харчовыя камітэты, рады селянскіх дэпутатаў і рады работніцкіх дэпутатаў а так сама, бежэнскія, палітычныя і культурныя арганізацыі, каторыя разам мелі каля 300 галасоў з агульнай лічбы. Прыймаючы пад увагу працу зробленую з'ездам да яго разгону 18 лютаго і разглядзеўшы рэзалюцыі прынятыя з'ездам до і пасьля афіцыяльнаго разгону трэба прызнаць яго удачным з боку нацыянальнаго і саўсім ніудачным з боку дзержаўнаго будаўнічаго. Нацыянальны здабытак з'езду,—гэта прызнанне ім нізгоднасьці беларускіх інтарэсаў з інтарэсамі дзержаўнаго вялікарускаго цэнтру і патрэбы для Беларусі свайго краёва-тэррыторыяльнаго органу Улады. Мінусам было прызнанне. што гэты орган павінен быць пабудованым на расійскі кшталт, павінен быць «Усебеларускаю Радаю Работніцкіх, Селянскіх і Салдацкіх дэпутатаў». Такое прызнанне «совдеповской» сыстэмы, было уступкай на карысьць бушаваўшаго навокал, ды і па самой Беларусі на фронце, расійскаму большэвізму. Іначэй ні можна сабе вытлумачыць факта што з'езд, на якім так часта раздаваліся галасы пакінуць усе партыі і фракцыі і злучацца усім каля беларускай еднасьці. прызнаў прынцып ўлады у сваёй істоці праціўны такой еднасьці. Аднак уступка ні памагла. З'езд, гэта вярцына, на якую за адзін год рэвалюцыі падняўся ў народзе нацыянальны рух, павінен быў раз'ехацца ні скончыўшы сваей працы, а уповажненая для узяцця улады Рада З'езду павінна была схавацца пад падлогу і чакаць лепшых дзён.

Кароткі іщчэ, пражыты намі час нямецкай акупацыі выявіў усю штучнасьць і ніжыццёвасьць прынятай З'ездам пад прымусам акаляючых умоваў сыстэмы ўлады. Адарваная ад расійскаго анархічнаго безначалія яна аказалася мёртвай. Замкнуўшыся у рамкі аднаго стану Рада і створэны ёю Сэкрэтарыят нічога ні здолалі зрабіць. Цяпер у складзе самай Рады расьцець пераканание ў патрэбі нацыянальнай ўсестановай коаліцыі. Калі пераканание абьявіцца ў факце, мы зноў вярнемся к таму, с чаго так добра і яскрава пачалі—Нацыянальнаму Камітэту у новай толькі форме.

Так с цяжкім возам народнай палітычна-нацыянальнай цемнаты і нідасьвячэння Беларусь едучы па гнілой грэблі ўсерасійскаго бэзладу ні пасунулася далей першай вярсты...

Цяпер сьмялей беларускія фурманы! Грэбля скончылася. Перад вашым возам шырокая гладкая шосса эўропэйскай дзержаўнасьці.

А. Н.

*) Гл. №№ 18 і 19.

Весткі с краю.

З лісту п. Сахачова, надрукаванаго у № 541 нямецкае «Газэты 10-ае арміі», мы даведываемся, што ў Лідзі сярод прыватных школ істнуюць 3 школы: нямецка-польская, нямецка-жыдоўская і талмудская. Адынчіць гэтыя школы і добра іх нарыхтаваць памог камэндант Ліды Альбэр. Школамі кірує адзін нямецкі ваенны настаўнік, катораму памагае адзін мейсцовы вучыцель. Школы гэтыя 5—ці клясовыя, дзеці прымаюцца ўжо ад 6 гадоў і ўносяць па магчымасьці нівялікую плату, але ад гэтаго ні залежыць папасьці у школу. Кожны кляс мае свайго на-

стаўніка побач з другімі вучыцелямі.

У кожным клясі што дня выкладаецца прынамсі адна лекцыя нямецкае мовы. У польскай школі вучуць польскай мові. у жыдоўскуй—гэбрайскай (жаргону мусіць німа). Апрача моваў выкладаюцца гісторыя, прыродазнаўства, географія, рахункі, гімнастыка і сьпеванне. Відаць, што гэта пачатковыя школы с 5-ю адзеламі.

У клясы ахвотна хо[дз]яць дзеці-хлопчыкі і дзяўч[ы]нкі, прымусу німа. Вучэнне пягнецца ад 8 да 1-ае гадзіны дня.

У школах вялікая чыстата, так сама як і на вуліцах Ліды (па распараджэнню з Вільні).

У клясах вісяць абразы, каторыя знаёмяць з жыцям натуры. Асобны пакой мае шмат картаў па географіі і рэчэй да наглядпаго навучання. Усяго гэтаго ёсьць досыць, дзякуючы гэтаму самаму Альбэру. Спыткі 1-ае клясы паказваюць, што дзеці трымаюцца чыста і вучацца старанна, а вучыцелі добра падгатоўлены. Вучыцялькі—кончыўшыя гімназію.

Шкада, што у лісьці п. Сахачова нічога ні успамінаецца аб беларускай мові. Калі німа яе у прыватных школах, та ёсьць хіба яна у скарбовых.

А.

Агульныя весткі.

На гадавым сходзі англіцкай нізалежнай работніцкай партыі ў Лейчэстэры аднадушна прынята рэзолюцыя, апавешчаючая, што толькі скоры дэмократычны мір на аснове угоды можэ выратаваць народы ад узаемнаіа зьнішчэньня. Маршалак сходу сказаў: «Я ні хацеў, каб немцы зьнішчылі нашу старонку, але я так сама ні жадаю, каб мы зьнішчылі Нямеччыну». Споўдэн сказаў: «Пакуль нашым краем будуць кіраваць такіе людзі, як Льлёйд Джордж, для нас і для ўсяго сьвету німа надзеі». («Гоман.»).

Павэдлуг урадоваго нямецкаго паведамлення з Бэрліну ад 22 г. м. ў ночы з 11 на 12 красавіка ангельскія ваенныя марскія сілы складаючыеся з мінаносцаў і гідропляпаў напалі на пабярэжжа Фландрыі. Остэндэ абстрэлівалася з цяжкіх гарматаў. Забрюгге абкідалося бомбамі з самалётаў. Напад быў з лёгкасьцю адбіты нямецкімі батарэямі, безніякіх вайсковых шкодаў для немцаў. Ніпрыяцельскі мінаносец каля Остэндэ запаліўшыся ад нямецкіх стрэлаў быў пакінуты камандай і пасьля узяты немцамі з усім абладаваннем.

Подлуг наведамлення ад 13 г. м. часьць нямецкаго флоту, якая падтрымоўвае акцыю успаможнаго нямецкаго войска у Фінляндзіі, 12 красавіка увайшла у Гельсінгфорскі порт і стала проціў гораду.

— З Амстэрдаму ад 12 красавіка паведамляюць: Рэйтэр даносіць с Пецербургу, што быўшыя у Гельсінгфорсе рускія ваенныя караблі вырушылі у Кроншадт. У звязку з гэтай інформацыяй стаіць далейшае паведамленне: 30 мінаносцаў, 40 падводных лодок і 50 транспартаў ні маглі быць выведзены і разброены у Гельсінгфорсе.

— З Бэрліну ад 12 г. м. паведамляюць: умацаваны на кшталт фортэцыі г. Армантьер бараніўся 11 красавіка ні гледзючы на штораз соціскаўшаеся акаляпне надта заўзято. Рэшткі гарнізону паддаліся калі дзякуючы ведамому нямецкаму націску аколяпы былі заходныя моцныя пункты апоры. Уліцы і край гораду перапоўнены трупамі.

—«Koln. Ztg» паведамляе з Амстэрдаму, што з Ньюйорку у Англію выежджае дэлегацыя складзеная з лідэраў работнікаў, банкаўскіх дзеячоў; ж.-д. дырэктараў, журналістаў, гвамадзянскіх работнікаў і ведамых кабет. Дэлегацыя мае перакапацца у Англіі, што можна зрабіць іпчэ для больш энэргічнаго вядзення вайны. Другое заданне дэлегацыі.—пераканаць агельцаў, што Амэрыка зробіць усё для пабеды.

— У Парыжу дазравае міністэрскі крызыс. Робяцца нарады аб замесьцінелю Клеманео. Опозыцыя хоча каб было радыкальнае міністэрство с Тома на чале.

— Японскі міністр заграпічных справаў Мотоно атрымаў одпуск і як спадзяюцца на сваё мейсца ні вернецца.

Весткі з Расіі.

— У Маскве адбыліся перавыборы у Маск. С. Р. К. С. Деп. Па атрыманым намі вёсткам да 5 красавіка большэвікоў было выбрапа 54 чал., левых с.-р. 2, меньшавікоў і безпартыйных 4 чалавекі і анархіст 1. Шмат на якіх фабрыках настрой моцна проціў—большэвіцкі.

— Установленая ад нідаўняго часу забарона ў'езду і выезду у Пецербург і прыгарады для асобаў ні маючых асобаго дазволу, цэнтральнай камісіей аб разгрузцэ Пецербургу адменена.

— Радай Народнай Гаспадаркі поўночнаго району выдана абавязковая пастанова аб дастаўцы усімі прэдпрыемствамі і адзольнымі асобамі ведамасьцяў аб чорным, чырвоным і белым мэталах якія у гэтых прэдпрыемстваў і асоб ёсьць у запасе.

— На Расію насуваецца безработце, як агульнае нішчасьце.

Стасоўна да гэтаго савецкім урадам і работніцкімі арганізацыямі робяцца заходы. каб зрабіць бяду меншай. У Маскве адкрылася касса безработных, якая будзе выдаваць помач грашмі і харчамі і аткрые сталовыя. Такая-ж касса арганізуецца у Пецербургу, дзе. Комісарыят працы за свой кошт атпраўляе работнікаў куды каму трэба. Бюро Усерасійскаго хаурусу эканамістаў-арганізатараў падае праэкт арганізаваць зараз жа: 1) сельска-гаспадарскія работы 2) вырабніцтво сельска-гаспадарскіх машынаў, арганізаваць карыстаючы з сілы безработных дэзынфэкцыю, сартоўку, рапарацыю і атпраўку на вёску старой салдацкай вопраткі, абутак і інш. Адзел Нарміроўкі Рабочай Сілы просіць абласныя Біржы працы сьпешна прыслаць яму ведамасьці аб лічбе безработных.

— Сталін-Джугашвілі падаў у Маскоўскі рэвалюцыйны трыбунал прозьбу пазваць на суд меньшэвіка Л. Мартова, за тое, што Мартоў у № 51 газэты «Впередъ» напісаў у артыкуле «аб артылерыйскай падгатоўцэ» нібыто ён, Сталін, у сваім часе быў выкінуты с партыйнай арганізацыі за учасьце у экспропрыяцыях.

— Большэвіцкая Маскоўская «Правда» піша: «На Віцебскім фронце спакойна. У горадзе парадак, Савецкая ўлада прадаўжае працаваць і умацоўваецца. Арганізацыя валастных радоў у нізанятых немцамі валасьцях ідзець поўным ходам. Атрымаць весткі с ванятых немцамі валасьцёў надта трудна». «Арганізацыя Чырвонай Арміі у Смаленску ідзець з вялікім усьпехам. Тутэйшыя аддзелы адыгралі рашучую ролю у астаноўцы націску праціўніка да 3 сакавіка на Оршу і Вітэбск... Ніхват толькі грошаў. За ўвесь час на адзелы атрымано 200000 рубл.».

Афіцыяльнае павядамленне нямецкаго вярхоўнаго камандавання за 15 красавіка 1918 року.

ЗАХАД. На полю бітвы каля р. Ліс ідуць частыя заўзятыя стычкі. На поўдзень—усход Ньеверкэрке, а також паміж Бэйель і Мэррые захоплены ангельскія кулямётныя гнёзды, салдаты узяты у палон. Контр'атакі ніпрыяцеля каля Бэйэль і поун.-заходней Бэтэн скончыліся для яго ніўдачна і з вялікімі стратамі. На ободвух берагох рэкі Соммы ішоў умерэнны, дзякуючы даждлівай пагодзе. артылерыйскі бой.

УСХОД. У Фінляндзіі нашае дзессантнае войско, падтрымліваемае марскімі аддзеламі, заняло пасьля ўпартых баеу з узброенымі бандамі Гельсінгфорс.

Першы Генэрал-кватэрмэйстар **фон-Людэндорф**.

МЕНСКАЕ ЖЫЦЦЕ.

Паміж жалезнадарожнікау вестка ад дэлегацыі служачых, што ездзіла у Кіеу, аб пераходзе вучастка Жлобін-Рамны да Украіны—вызвала вялікае абурэнне. Жалезнодарожнікі ні думаюць дабравольна пакідаць свае мейсцы.

Реарганізацыя міліцыі скончана. Са спіску служачых выкасована 152 міліцыанэрау. Астаушыяся на службе муштруюцца на нямецкі лад. Нямецкі ваенны паліцмэйстар што тыдня заглядае у кажны міліцэйскі вучастак.

Прыстауляныя у кажны с 5-ці вучасткау па два эмісары с паміж русскіх афіцэрау, ведаючых добра нямецкую мову, заняты пакуль што пярэкладамі прыказау нямецкіх граданачальніка і паліцмэйстра з нямецкай на русскую мову. Пэнсыі ім назначана па 400 р. у месяц.

У Губэрскае Прысутства ужо шмат паступіло спрау у выкупна-ченшавы аддзел, хаця пакуль што аддзел гэты ні аткрыты (працуе толькі адзін судовы аддзел).

Путаніца с сэрвітутамі, шахауніцамі і іншымі падобнымі справамі паміж цэлымі селянскімі вобшчэствамі, як князь Вітгэнштэйн, гр. Чапскі і інш. —цягнуцца дзесяткі гадоу і асабліва цяпер пара ік разабраць і скончыць

Трэба спадзявацца, што нямецкае начальства ня будзе перашкаджаць наладзіць так канешна патрэбны у нас выкупна—чыншавы аддзел.

Найбольш гэткіх спрау у Барысаускім, Слуцкім і Ігуменскім паветах.

У нямецкай разменнай касе на пляцу Свабоды крыху ужо наладзіуся парадак з разменам „царскіх“ і «керэнскіх» грошэй на нямецкія, што дае можнасьць абмінуць лапы спэкулянтау. За «царскі» рубель даюць $1^1/_4$—нямецкіх

У канцы гэтаго тыдня маняцца выйсьці ужо гарадзкія боны, калі ні будзе якіх ніспадзеваных перашкодау.

Рэгістрацыя салдатау канчаецца. Заходзяць ужо толькі адзіночкі. Да суботы—13-га красав. прайшло праз рэгістрацыю 9.050 чалав.

У гарадзкой рэзніцы за апошнія часы рэжуць усяго па некалькі штук рагатай жывелы, калі дауней што дня вырэзвалі цэлыя соткі галоу.

Ніжэйшыя і сярэднія рамесляныя школы. 11-га красавіка у губэрнскім земстве адбылася нарада разам с прэдстаунікамі места, стройзапа і саюза інжэнерау і тэхнікау, на каторай прынято шмат праэктау аткрыцця рожнаго тыпу школ:

1) будоуляно-сталярная,
2) слесарно-кавальская,
3) дзесятнікау будоуляных,
4) хіміко-тэхнічная,
5) сярэдняя тэхнічная,
6) каморніцко - мэліоратыуныя курсы.

Апрача таго, было зауяляно сабранню, што Азарынскае ніжэйшае народнае сельска-гаспадарскае вучылішчэ мае быць перарабляно у сельска-гаспадарскую школу.

Азарынскае вучылішчэ—у бабруйскім павеце, у ім навука ідзе толькі зімой, а летам вучні раз'ежаюцца да дому на практыку.

І ішчэ адзін цікауны праэкт: перарабіць пустуючыя цяпер у нашай губэрніі 200. бровароу пад ніжэйшыя сельска-гаспадарскія школы.

Праэктау у нас зауседы хватае і нават добрых, усе толькі залежа ад таго, як яны прайдуць у жыцце і у чые рукі пападуць новыя культурныя гнезды.

Пачтово-тэлеграфным чыноунікам, якія засталіся ішчэ у Менску, іх начальство запранавана зараз жэ усім зарэгістрыровацца агульна прынятым парадкам.

Рэгістрацыя быушых паліцэйскіх служачых мае адбыцца у хуткім часе; ім будзе запранована атпаведная служба у міліцыі Нікаторым быушым паліцэйскім ужо давалі мейсцы, але тыя, зважаючы на ніпэунасьць у будучыне, адмауляюцца. Свабодныя мейсцы камісарау і іх памоцнікау будуць запрапанованы афіцэрам.

Нямецкай ухадай зроблена заява гарадзкой думе ні выдаваць ніякіх абавязковых пастановау.

Так сама замест выбарных судзьдзяу, як гэта зрабіла гарадзкая дума, маюць быць судзьдзі па назначэнню.

Камандуючы нямецкім войскам выдау прыказ:

1) Усе безпрауна забранае з дварою і фальваркау, як інвэнтар, жывела, насенне, харчы, гаспадарскія машыны прылады, дрэво і інш. зараз жэ павінна быць зьвернута уласьнікам.

Уселякія споркі разбірае суд зложаны з аднаго селяніна, аднаго памешчыка і судзьдзі—як прэдседацеля. Судзьдзю назначае начальнік воласьці. Апэляцыю можна падаваць павятоваму начальніку. Пастановы павятоваго начальніка павінны быць споуняны, інакш можэ быць арышт., або турма.

Уся ворная зямля, на якой можна спадзевацца пэунаго ураджаю павінна быць засеяна.

Усе землеуласьнікі, або іх камісары павінны зараз-жэ вярнуцца і узяцца за гаспадарку. Калі гэта ні будзе зроблена на праз 8 дзен 10.000 рубл. штрафу, а калі ішчэ праз … дзен ні возьмуцца за работу, то гэто будзе зробляно на рахунак земляуласьніка.

Апрача таго, зямля, каторую сам гаспадар ні здолее засеяць, будзе засеяна прымусовым спосабам.

Курсы беларусознауства.

Ауторак 16 красавіка.
Т. Грыб. *Нашые песьняры: І. Янка Купала.*

Серада 17 красавіка.
Язэп Ліосік. *Гісторыя Вялікаго Княства Літоускаго.*

Чацьвер 18 красавіка.
Праф. д-р Массоніус. *Гісторыя беларускае мовы.*

Пачатак лекцыі у 6 гадз. веч.

Рэдактар **А. Прушынскі**.

Выдавецтво **Т-во «Заранка»**.